ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
15 ліпеня 2020 г. № 197

## Аб вучэбных планах спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі

На падставе пункта 9 артыкула 279 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць:

вучэбны план цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі і (або) множнымі фізічнымі і (або) псіхічнымі парушэннямі (дадаецца);

вучэбны план спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннем слыху (дадаецца);

вучэбны план спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннямі зроку (дадаецца);

вучэбны план спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення (дадаецца);

вучэбны план спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні) (дадаецца);

вучэбны план спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (дадаецца);

вучэбны план спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю (дадаецца).

2. Прызнаць страціўшай сілу пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 верасня 2019 г. № 150 «Аб вучэбных планах спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі».

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 1 верасня 2020 г.

**Міністр** **І.В.Карпенка**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

### ВУЧЭБНЫ ПЛАН
### цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для выхаванцаў з цяжкімі і (або) множнымі фізічнымі і (або) псіхічнымі парушэннямі

| **І. Адукацыйныя вобласці** | Колькасць вучэбных гадзін[1] на тыдзень на групу | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Першая сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Другая сярэдняя (ад 5 да 6 гадоў) | Першая старшая (ад 6 да 7 гадоў) | Другая старшая (ад 7 да 8 гадоў) |
| 1. Самаабслугоўванне* | 1 (1)[2] | 2 (1)[2] | 2 (1)[2] | – | – |
| 2. Камунікацыя** | 1 (0,5)[2] | 1,5 (0,5)[2] | 1,5 (0,5)[2] | 1,5 (0,5)[2] | 1,5 (0,5)[2] |
| 3. Сэнсарная стымуляцыя** | 1 (1)[2] | 2 (1)[2] | 2 (1)[2] | 2 (1)[2] | 2 (1)[2] |
| 4. Прадметная дзейнасць** | 1,5 (1)[2] | – | – | – | – |
| 5. Я і свет* | – | – | – | 2 (1)[2] | 2 (1)[2] |
| 6. Гульня** | – | 1,5 (1)[2] | 1,5 (1)[2] | 1,5 (1)[2] | 1,5 (1)[2] |
| 7. Выяўленчая дзейнасць* | 2,5 (1)[2] | 3 (1)[2] | 3 (1)[2] | 3 (1)[2] | 3 (1)[2] |
| 8. Музычна-рытмічныя заняткі | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 9. Адаптыўная фізічная культура | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 |
| **Усяго** | 12 (4,5)[2] | 15 (4,5)[2] | 15 (4,5)[2] | 15 (4,5)[2] | 15 (4,5)[2] |
| Максімальна дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | 3 (3 г.) | 5 (5 г.) | 5 (5 г.) | 6,25 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **II. Карэкцыйныя заняткі** | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | |
| | 53 (7)[2] | 35 (7)[2] | 26 (7)[2] | 20 (7)[2] | 20 (7)[2] |
| Агульная колькасць вучэбных гадзін на тыдзень | 65 (11,5)[2] | 50 (11,5)[2] | 41 (11,5)[2] | 35 (11,5)[2] | 35 (11,5)[2] |

---

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;

у першай сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;

у другой сярэдняй групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;

у першай старшай групе (ад 6 да 7 гадоў) – 30–35 хвілін;

у другой старшай групе (ад 7 да 8 гадоў) – 30–35 хвілін.

[2] У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін пры атрыманні спецыяльнай адукацыі дома.

**Заўвагі**:

1. У дадзеным вучэбным плане выкарыстоўваюцца наступныя абазначэнні:

* заняткі праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе;

** заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг у падгрупе.

2. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

## ВУЧЭБНЫ ПЛАН
## спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннем слыху

| Адукацыйныя вобласці | Колькасць вучэбных гадзін[1] на тыдзень на групу | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў)[2] | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7 (8) гадоў) |
| 1. Фізічная культура | 1 | 2 | 3[3] | 3[3] | 3[3] | 3[3] |
| 2. Дзіця і грамадства* | 0,5 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| 3. Элементарныя матэматычныя ўяўленні** | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4. Дзіця і прырода* | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5. Развіццё маўлення**[4] | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 6. Развитие речи**[5] | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 7. Падрыхтоўка да навучання грамаце** | – | – | – | – | 1 | 1 |
| 8. Выяўленчае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9. Музычнае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10. Мастацкая літаратура | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень** | 8 | 10 | 12 | 14 | 15 | 15 |
| Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | 0,7/0,9[6] (40/56[6] хв.) | 1,7 (1 г. 40 хв.) | 3 (3 г.) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **Карэкцыйныя заняткі**[7] | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | | |
| 1. Развіццё маўлення | 126 | 86 | 55 | 30 | 28 | 28 |
| 2. Развіццё слыхавога ўспрымання і навучанне вымаўленню | | | | | | |
| 3. Развіццё пазнавальнай дзейнасці | | | | | | |

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ў спецыяльнай дашкольнай установе разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у групе другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) – 5 хвілін (першае паўгоддзе), 7 хвілін (другое паўгоддзе);

у першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) – 10 хвілін;

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;

у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;

у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;

у старшай групе (ад 6 да 7(8) гадоў) – 30–35 хвілін.

[2] У групе другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў) праводзяцца толькі індывідуальныя заняткі.

[3] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[4] Змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на беларускай мове.

[5] Змест адукацыйнай галіны «Развитие речи» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове.

[6] Другое паўгоддзе.

[7] Карэкцыйныя заняткі рэалізуюцца ў працы з дзецьмі з парушэннем слыху і з дзецьмі з парушэннем слыху, кампенсаваным кахлеарным імплантам.

**Заўвагі**:

1. У дадзеным вучэбным плане выкарыстоўваюцца наступныя абазначэнні:

* заняткі праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе;

** заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг у падгрупе.

2. Дадзены вучэбны план разам з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі з’яўляюцца асновай для распрацоўкі і зацвярджэння вучэбнага плана ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадстаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), якая рэалізуе адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі (далей – установа адукацыі), на бягучы навучальны год у групах інтэграванага навучання і выхавання для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

3. На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, а таксама для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў групах інтэграванага навучання і выхавання, на аднаго выхаванца, які не чуе, выдзяляецца 3,5 гадзіны на тыдзень. На выхаванца, які слаба чуе, – 2,5 гадзіны на тыдзень. Указаная колькасць гадзін праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам і размяркоўваецца на адукацыйныя вобласці, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «**», і напрамкі карэкцыйных заняткаў з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў на падставе заключэння цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

## ВУЧЭБНЫ ПЛАН
### спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннямі зроку

| **Адукацыйныя вобласці** | Колькасць вучэбных гадзін[1] на тыдзень на групу | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў)[2] | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7(8) гадоў) |
| 1. Фізічная культура | 1 | 2 | 3[3] | 3[3] | 3[3] | 3[3] |
| 2. Дзіця і грамадства* | 0,5 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| 3. Элементарныя матэматычныя ўяўленні* | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4. Дзіця і прырода* | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5. Развіццё маўлення*[4] | 1 (0) | 1 (0) | 1 (1[6]) | 1 (1) | 1 (1) | 1 (1) |
| 6. Развитие речи*[5] | 1 (0) | 1 (0) | 1 (1[6]) | 1 (1) | 1 (1) | 1 (1) |
| 7. Падрыхтоўка да навучання грамаце* | – | – | – | – | 1 | 1 |
| 8. Выяўленчае мастацтва* | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9. Музычнае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10. Мастацкая літаратура | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| **Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень** | 8 | 10 | 11/12[6] | 14 | 15 | 15 |
| Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | 0,7/0,9[6] (40/56[6] хв.) | 1,7 (1 г. 40 хв.) | 3 (3 г.) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **Карэкцыйныя заняткі** | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | | |
| 1. Развіццё зрокавага ўспрымання | 128 | 90 | 60 | 36 | 36 | 36 |
| 2. Сацыяльна-бытавая арыенціроўка | | | | | | |
| 3. Прасторавае арыентаванне і мабільнасць | | | | | | |
| 4. Развіццё пазнавальнай дзейнасці | | | | | | |

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ў спецыяльнай дашкольнай установе разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у групе другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) – 5 хвілін (першае паўгоддзе), 7 хвілін (другое паўгоддзе);

у першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) – 10 хвілін;

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;

у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;

у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;

у старшай групе (ад 6 да 7(8) гадоў) – 30–35 хвілін.

[2] У групе другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў) праводзяцца толькі індывідуальныя заняткі.

[3] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[4] Змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца

на беларускай мове. У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Развитие речи».

[5] Змест адукацыйнай галіны «Развитие речи» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове. У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення».

[6] Другое паўгоддзе.

**Заўвагі**:

1. Заняткі па адукацыйным абласцям, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «*», праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе.

2. Дадзены вучэбны план разам з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі з’яўляюцца асновай для распрацоўкі і зацвярджэння вучэбнага плана ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадстаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), якая рэалізуе адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі (далей – установа адукацыі), на бягучы навучальны год у групах інтэграванага навучання і выхавання для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

3. На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, а таксама для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў групах інтэграванага навучання і выхавання, на аднаго выхаванца, які не бачыць, выдзяляецца 3,5 гадзіны на тыдзень. На выхаванца, які слаба бачыць, – 2,5 гадзіны на тыдзень. Указаная колькасць гадзін праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам і размяркоўваецца на адукацыйныя вобласці, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «*», і напрамкі карэкцыйных заняткаў з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў на падставе заключэння цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

## ВУЧЭБНЫ ПЛАН
## спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення[1]

| Адукацыйныя вобласці | Колькасць вучэбных гадзін[2] на тыдзень на групу | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў)[3] | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7 (8) гадоў) |
| 1. Фізічная культура | – | 2 | 3[4] | 3[4] | 3[4] | 3[4] |
| 2. Дзіця і грамадства* | – | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| 3. Элементарныя матэматычныя ўяўленні* | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4. Дзіця і прырода* | – | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5. Развіццё маўлення**[5] | – | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 6. Развитие речи**[6] | – | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 7. Падрыхтоўка да навучання грамаце** | – | – | – | – | 1 | 1 |
| 8. Выяўленчае мастацтва | – | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9. Музычнае мастацтва | – | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10. Мастацкая літаратура | – | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень** | – | 10 | 12 | 14 | 15 | 15 |
| Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | – | 1,7 (1 г. 40 хв.) | 3 (3 г.) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **Карэкцыйныя заняткі** | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | | |
| 1. Фарміраванне лексіка-граматычных сродкаў мовы і развіццё звязнага маўлення | – | 86 | 56 | 40 | 34 | 34 |
| 2. Фарміраванне вымаўленчага боку маўлення | | | | | | |
| 3. Лагарытмічныя заняткі | | | | | | |
| 4. Нармалізацыя тэмпа-рытмічнай арганізацыі маўлення ў працэсе азнаямлення з навакольным светам | | | | | | |
| 5. Нармалізацыя тэмпа-рытмічнай арганізацыі маўлення ў працэсе прадуктыўнай дзейнасці | | | | | | |

[1] Дадзены вучэбны план рэалізуецца ў групах для дзяцей з агульным недаразвіццём маўлення, у групах для дзяцей з заіканнем.

[2] Пад вучэбнымі гадзінамі ў спецыяльнай дашкольнай установе разумееццa час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) – 10 хвілін;

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;

у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;

у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;

у старшай групе (ад 6 да 7(8) гадоў) – 30–35 хвілін.

[3] Групы для дзяцей з агульным недаразвіццём маўлення і заіканнем другога ранняга ўзросту, першая малодшая группа для дзяцей з заіканнем не камплектуюцца.

[4] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[5] Змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на беларускай мове.

[6] Змест адукацыйнай галіны «Развитие речи» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове.

**Заўвагі**:

1. У дадзеным вучэбным плане выкарыстоўваюцца наступныя абазначэнні:

* заняткі праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе;

** заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг у падгрупе.

2. Дадзены вучэбны план разам з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі з’яўляюцца асновай для распрацоўкі і зацвярджэння вучэбнага плана ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадстаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), якая рэалізуе адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні

дашкольнай адукацыі (далей – установа адукацыі), на бягучы навучальны год у групах інтэграванага навучання і выхавання для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

3. На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, а таксама для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў групах інтэграванага навучання і выхавання, на аднаго выхаванца з цяжкімі парушэннямі маўлення выдзяляецца 2,5 гадзіны на тыдзень. Указаная колькасць гадзін праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам і размяркоўваецца на адукацыйныя вобласці, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «**», і напрамкі карэкцыйных заняткаў з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў на падставе заключэння цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

5. Карэкцыйныя заняткі «Фарміраванне лексіка-граматычных сродкаў мовы і развіццё звязнага маўлення», «Фарміраванне вымаўленчага боку маўлення» рэалізуюцца ў групе для дзяцей з агульным недаразвіццем маўлення. Карэкцыйныя заняткі «Лагарытмічныя заняткі», «Нармалізацыя тэмпа-рытмічнай арганізацыі маўлення ў працэсе азнаямлення з навакольным светам», «Нармалізацыя тэмпа-рытмічнай арганізацыі маўлення ў працэсе прадуктыўнай дзейнасці» рэалізуюцца ў групах для дзяцей з заіканнем. Пры неабходнасці ў працы з дзецьмі з заіканнем можа рэалізоўвацца карэкцыйны занятак «Фарміраванне вымаўленчага боку маўлення». Карэкцыйныя заняткі «Лагарытмічныя заняткі» праводзіць настаўнік-дэфектолаг сумесна з музычным кіраўніком.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

## ВУЧЭБНЫ ПЛАН
## спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні)

| **Адукацыйныя вобласці** | Колькасць вучэбных гадзін[1] на тыдзень на групу | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў)[2] | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7 (8) гадоў) |
| 1. Фізічная культура | 1 | 2 | 3[3] | 3[3] | 3[3] | 3[3] |
| 2. Дзіця і грамадства* | 0,5 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| 3. Элементарныя матэматычныя ўяўленні** | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4. Дзіця і прырода* | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5. Развіццё маўлення*[4] | 1 (0) | 1 (0) | 1 (1[6]) | 1 (1) | 1 (1) | 1 (1) |
| 6. Развитие речи*[5] | 1 (0) | 1 (0) | 1 (1[6]) | 1 (1) | 1 (1) | 1 (1) |
| 7. Падрыхтоўка да навучання грамаце* | – | – | – | – | 1 | 1 |
| 8. Выяўленчае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9. Музычнае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10. Мастацкая літаратура | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| **Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень** | 8 | 10 | 11/12[6] | 14 | 15 | 15 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | 0,7/0,9[6] (40/56[6] хв.) | 1,7 (1 г. 40 хв.) | 3 (3 г.) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **Карэкцыйныя заняткі** | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | | |
| 1 Навучанне гульні | 128 | 90 | 59 | 34 | 34 | 34 |
| 2. Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам | | | | | | |
| 3. Развіццё пазнавальнай дзейнасці | | | | | | |
| 4. Фарміраванне навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння | | | | | | |
| 5. Фарміраванне сацыяльных паводзін | | | | | | |

---

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ў спецыяльнай дашкольнай установе разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у групе другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) – 5 хвілін (першае паўгоддзе), 7 хвілін (другое паўгоддзе);

у першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) – 10 хвілін;

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;

у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;

у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;

у старшай групе (ад 6 да 7(8) гадоў) – 30–35 хвілін.

[2] У групе другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў) праводзяцца толькі індывідуальныя заняткі.

[3] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[4] Змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на беларускай мове. У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Развитие речи».

[5] Змест адукацыйнай галіны «Развитие речи» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове. У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення».

[6] Другое паўгоддзе.

**Заўвагі**:

1. У дадзеным вучэбным плане выкарыстоўваюцца наступныя абазначэнні:

* заняткі праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе;

** заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг у падгрупе.

2. Дадзены вучэбны план разам з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі з’яўляюцца асновай для распрацоўкі і зацвярджэння вучэбнага плана ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадстаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), якая рэалізуе адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі (далей – установа адукацыі), на бягучы навучальны год у групах інтэграванага навучання і выхавання для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

3. На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, а таксама для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў групах інтэграванага навучання і выхавання, на аднаго выхаванца з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні) выдзяляецца 2,5 гадзіны на тыдзень. Указаная колькасць гадзін праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам і размяркоўваецца на адукацыйныя вобласці, якія абазначаны ў

дадзеным вучэбным плане знакам «**», і напрамкі карэкцыйных заняткаў з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў на падставе заключэння цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

5. Карэкцыйныя заняткі «Навучанне гульні», «Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам», «Развіццё пазнавальнай дзейнасці» рэалізуюцца ў працы з дзецьмі з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні) і могуць рэалізоўвацца ў працы з дзецьмі з аутыстычнымі парушэннямі ў спалучэнні з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні). Карэкцыйныя заняткі «Фарміраванне навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння», «Фарміраванне сацыяльных паводзінаў» рэалізуюцца ў працы з дзецьмі з аутыстычнымі парушэннямі ў спалучэнні з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні).

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

# ВУЧЭБНЫ ПЛАН
## спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату

| **Адукацыйныя вобласці** | Колькасць вучэбных гадзін[1] на тыдзень на групу | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў)[2] | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7 (8) гадоў) |
| 1. Адаптыўная фізічная культура | 1 | 2 | 3[3] | 3[3] | 3[3] | 3[3] |
| 2. Дзіця і грамадства* | 0,5 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| 3. Элементарныя матэматычныя ўяўленні* | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4. Дзіця і прырода* | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5. Развіццё маўлення*[4] | 1 (0) | 1 (0) | 1 (1[6]) | 1 (1) | 1 (1) | 1 (1) |
| 6. Развитие речи*[5] | 1 (0) | 1 (0) | 1 (1[6]) | 1 (1) | 1 (1) | 1 (1) |
| 7. Падрыхтоўка да навучання грамаце* | – | – | – | – | 1 | 1 |
| 8. Выяўленчае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9. Музычнае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10. Мастацкая літаратура | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| **Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень** | 8 | 10 | 11/12[6] | 14 | 15 | 15 |
| Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | 0,7/0,9[6] (40/56[6] хв.) | 1,7 (1 г. 40 хв.) | 3 (3 г.) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **Карэкцыйныя заняткі** | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | | |
| 1. Развіццё рухальнай мабільнасці | 128 | 90 | 60 | 36 | 36 | 36 |
| 2. Сэнсарнае развіццё | | | | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3. Развіццё камунікатыўных уменняў | | | | | | |
| 4. Развіццё пазнавальнай дзейнасці | | | | | | |
| 5. Развіццё гульнёвай дзейнасці | | | | | | |

---

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ў спецыяльнай дашкольнай установе разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у групе другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) – 5 хвілін (першае паўгоддзе), 7 хвілін (другое паўгоддзе);

у першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) – 10 хвілін;

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;

у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;

у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;

у старшай групе (ад 6 да 7(8) гадоў) – 30–35 хвілін.

[2] У групе другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў) праводзяцца толькі індывідуальныя заняткі.

[3] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[4] Змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на беларускай мове. У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Развитие речи».

[5] Змест адукацыйнай галіны «Развитие речи» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове. У дужках даецца колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення».

[6] Другое паўгоддзе.

**Заўвагі**:

1. Заняткі па адукацыйным абласцям, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «*», праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе.

2. Дадзены вучэбны план разам з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі з'яўляюцца асновай для распрацоўкі і зацвярджэння вучэбнага плана ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадстаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), якая рэалізуе адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі (далей – установа адукацыі), на бягучы навучальны год у групах інтэграванага навучання і выхавання для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

3. На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, а таксама для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў групах інтэграванага навучання і выхавання, на аднаго выхаванца з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значнымі парушэннямі руху або яго адсутнасцю) выдзяляецца 3,5 гадзіны на тыдзень. Указаная колькасць гадзін праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам і размяркоўваецца на адукацыйныя вобласці, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «*», і напрамкі карэкцыйных заняткаў з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў на падставе заключэння цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 197

## ВУЧЭБНЫ ПЛАН
## спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю

| **Адукацыйныя вобласці** | Колькасць вучэбных гадзін[1] на тыдзень на групу | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7 гадоў) | Старшая (ад 7 да 8 гадоў) |
| 1. Фізічная культура | 3[2] | 3[2] | 3[2] | 3[2] | 3[2] |
| 2. Дзіця і грамадства* | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 3. Элементарныя матэматычныя ўяўленні** | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4. Дзіця і прырода* | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 5. Развіццё маўлення**[3] | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 6. Развитие речи**[4] | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 7. Падрыхтоўка да навучання грамаце** | – | – | 1 | 1 | 1 |
| 8. Выяўленчае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9. Музычнае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10. Мастацкая літаратура | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| **Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень** | 12 | 14 | 15 | 15 | 15 |
| Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка на тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах) | 3 (3 г.) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |
| **Карэкцыйныя заняткі** | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень на групу | | | | |
| 1. Гульня | 55 | 30 | 30 | 30 | 30 |
| 2. Сацыяльна-эмацыянальнае развіццё | | | | | |
| 3. Прасторава-часовая арыенціроўка | | | | | |
| 4. Развіццё пазнавальнай дзейнасці | | | | | |
| 5. Фарміраванне навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння | | | | | |
| 6. Фарміраванне сацыяльных паводзін | | | | | |

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ў спецыяльнай дашкольнай установе разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым і індывідуальным магчымасцям выхаванца, заканадаўству ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Працягласць заняткаў складае:

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15–20 хвілін;
у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20–25 хвілін;
у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25–30 хвілін;
у старшай групе (ад 6 да 7 гадоў) – 30–35 хвілін;
у старшай групе (ад 7 да 8 гадоў) – 30–35 хвілін.

[2] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[3] Змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на беларускай мове.

[4] Змест адукацыйнай галіны «Развитие речи» рэалізуецца ва ўстановах адукацыі (спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове.

**Заўвагі**:

1. У дадзеным вучэбным плане выкарыстоўваюцца наступныя абазначэнні:

* заняткі праводзіць выхавацель дашкольнай адукацыі (іншы педагагічны работнік) у падгрупе;

** заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг у падгрупе.

2. Дадзены вучэбны план разам з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі з'яўляюцца асновай для распрацоўкі і зацвярджэння вучэбнага плана ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадстаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), якая рэалізуе адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю (далей – установа адукацыі), на бягучы навучальны год у групах інтэграванага навучання і выхавання для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

3. На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, а таксама для выхаванцаў, якія засвойваюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ў групах інтэграванага навучання і выхавання, на аднаго выхаванца з інтэлектуальнай недастатковасцю выдзяляецца 3,5 гадзіны на тыдзень. Указаная колькасць гадзін праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам і размяркоўваецца на адукацыйныя вобласці, якія абазначаны ў дадзеным вучэбным плане знакам «**», і напрамкі карэкцыйных заняткаў з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку карэкцыйных заняткаў, іх колькасці і формы правядзення (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (або) псіхічных парушэнняў выхаванцаў на падставе заключэння цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

5. Карэкцыйныя заняткі «Гульня», «Сацыяльна-эмацыянальнае развіццё», «Прасторава-часовая арыенціроўка», «Развіццё пазнавальнай дзейнасці» рэалізуюцца ў групах для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю і могуць рэалізоўвацца ў працы з дзецьмі з аутыстычнымі парушэннямі ў спалучэнні з інтэлектуальнай недастатковасцю. Карэкцыйныя заняткі «Фарміраванне навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння», «Фарміраванне сацыяльных паводзінаў» рэалізуюцца ў працы з дзецьмі з аутыстычнымі парушэннямі ў спалучэнні з інтэлектуальнай недастатковасцю.